# Круглы стол «Зямля – наш агульны дом»

## Выхаванне ў вучняў 6–8 класаў адказных адносін да прыроды роднага краю

**Прырода – крыніца прыгажосці, наша карміцелька і лекарка. Яна адорвае свет разнастайнасцю фарбаў, дапамагае людзям адчуць лепшае ў сабе, быць здаровамі і шчаслівымі. Але ці заўсёды мы з удзячнасцю і пашанай ставімся да маці-прыроды, ці беражом яе? Ёй жа сёння бывае цяжка, асабліва тады, калі няшчадна высякаюцца лясы, забруджваюцца рэкі і азёры, руйнуецца спрадвечны ландшафт… Чалавек часта прыносіць шкоду прыродзе, навакольнаму свету, не разважаючы пра магчымыя наступствы. А менавіта праз безадказнасць і недальнабачнасць з'яўляюцца экалагічныя праблемы. Сёння трэба не толькі любіць прыроду,але і ахоўваць яе. А для гэтага неабходна імкнуцца ведаць пра яе як мага больш, дзяліцца экалагічнымі ведамі з іншымі. З гэтай мэтай і быў праведзены круглы стол «Зямля – наш агульны дом».**

***Мэты:*** выхоўваць у вучняў экалагічную культуру, пашыраць веды, развіваць творчыя здольнасці.

***Падрыхтоўчы этап.*** Вучням даюцца апераджальныя творчыя заданні. Для іх выканання ствараюцца групы: «Літаратары», «Артысты», «Журналісты», «Эколагі», «Біёлагі». Кожная група размешчана за асобным сталом.

**І. Прывітальнае слова настаўніка**

Добры дзень,мы вітаем вас шчыра.
Як цудоўна сустрэцца сябрам!
Хай гучыць слоў пявучая ліра,
Вам усім мы жадаем дабра!

*(Гучыць у запісе птушыны шчэбет, шум мора, лесу.)*

– Мы жывём у цудоўным ,маляўнічым краі.Унікальнае возера Свіцязь прываблівае сваёй прыгажосцю многа турыстаў і адпачываючых. Прыгожыя лясы запрашаюць летам і ўвосень у ягады і грыбы. Частуйся,чалавек,радуйся прыродзе,адпачывай!

Але апошнім часам мы дзе-нідзе бачым нядбайныя адносіны чалавека да прыроды. Гэта і кінутае смецце пасля адпачынку на прыродзе ,і пакалечанае дрэва ў час збору бярозавага соку, і вырваныя з каранямі лекавыя расліны, і раскладзеныя вогнішчы ў лесе.

Сёння мы абмяркуем, што трэба рабіць, каб наша маленькая радзіма была прыгожай, вабіла да сябе птушынымі спевамі, чыстымі азёрамі і рэкамі, празрыстым паветрам.

Першымі выступяць «журналісты». Яны бралі інтэрв'ю ў вучняў нашай школы.

**ІІ. Выступленне «журналістаў»**

– Мы наведалі амаль усе класы нашай школы і задалі вучням пытанні.

1. Што вы робіце, каб птушкам было лягчэй перазімаваць? (*Кармушкі, куды кожную раніцу насыпаем зярняткі. Разам з бацькамі зрабілі шпакоўні.*)

2. Ці можна дапамагчы рыбам перазімаваць? Ці патрэбна ім дапамога людзей? (*У невялікіх вадаёмах, калі яны пакрываюцца лёдам, рыбе не хапае кіслароду, таму разам з дарослымі мы робім лункі, каб рыбе можна было дыхаць.)*

3. Што робіце вы,каб зберагчы лес?(*Вясною мы дапамагалі лясніцтву пасадзіць малады лес. Сярод малодшых школьнікаў праводзім гутаркі,каб яны не разбуралі гнёзды і мурашнікі,не раскладалі ў лесе вогнішчы,не вырывалі з каранямі лекавыя расліны. Пільна сочым,каб людзі збіралі ягады ўручную,а не пры дапамозе так званага ручнога камбайна. Мы ведаем, што калі збіраць ягады камбайнам, то псуюцца галінкі ў кусцікаў чарніц, і ў наступным годзе на гэтых кусціках ягад будзе зусім мала. А гэтым летам у нашым лесе з'явіліся чорныя буслы, вельмі рэдкія птушкі, занесеныя ў Чырвоную кнігу. Мы зробім усё, каб яны прыжыліся ў нас.)*

**Настаўнік.** Дзякуем за працу. Далей слова прадстаўляецца «артыстам».

**III. Выступленне «артыстаў»**

– Шмат твораў прысвяцілі беларускія паэты роднай прыродзе. Зараз мы прачытаем вам верш, каб вы задумаліся над праблемай выратавання прыроды.

*Першы чытальнік*

Яна, цярплівая, маўчыць.
Пара ёй закрычаць, прыродзе.
Але чамусьці не крычыць.
Магчыма, крык той не даходзіць.

Яна з адкрытаю душой,
Яна да нас заўжды з пяшчотай,
А мы – сякерай і пілой,
Няўдзячныя, частуем шротам.

Душу патрэбна ёй адкрыць,
Няхай натхняюць лес і краскі.
Тады і птушкі, і звяры
Не перасяляцца ў казкі.

*(Юрась Свірка)*

*Другі чытальнік.* Народнае павер'е сцвярджае,што белы бусел прыносіць шчасце: «Не згарыш ніколі,браце,калі бусел ёсць на хаце».

Няма радзімы без бацькоўскай хаты ;
Бусліны клёкат – гэта родны дом;
Ты будзеш жыць шчаслiва і багата,
Калі над хатай – буслава гняздо.

А летнім днём блакіт нябёс бясконцы
І воблакі – мелодыя без слоў,

І над зямлёю роднай наша сонца,
І крылле прамяністае буслоў.

Буслы да нас вясною зноўку вернуцца,
Як на зямлі прадзюбнецца трава.
Без чалавечай і буслінай вернасці
Няма ні дабрыні,ні характва.

*(Пімен Панчанка)*

*(Гучыць песня «Аист на крыше» (сл. А. Папярэчнага, муз. Д. Тухманава).)*

**Настаўнік.** Дзякуй вам за цудоўна падабраныя і натхнёна прачытаныя вершы. Вучні групы «Літаратары» паспрабавалі напісаць легенды, вершы, апавяданні на тэму прыроды. Запросім іх прачытаюць свае творчыя работы.

**IV. Выступленне «літаратараў»**

*Стасевіч Аляксандра зачытвае «Легенду пра лес», якую яна напісала.*

«Калісьці даўно на месцы старога лесу была пустэча. Нікому гэта зямля не прыносіла ні радасці, ні карысці. Была яна патрэсканая, высахлая.

Людзі паміралі ад голаду, летам пакутавалі ад спякоты, зімою – ад холаду. «Дзе ж выйсці?» – плакалі яны.

Жыў у нашых мясцінах хлопец, сын удавы. Звалі яго Яраш, бо быў ён вельмі дужы. Але не толькі дужы быў хлопец, а разумны і прыгожы. Паважалі яго людзі за незвычайную мудрасць. Нават старыя людзі заўсёды раіліся з ім. Умеў Яраш не толькі з людзьмі гаварыць, а і з птушкамі, дрэвамі, звярамі. Вырашыў ён пасадзіць лес і выратаваць сваіх землякоў. А дзе ўзяць дрэўцы для пасадак? Звярнуўся ён да птушак, што ў полі гнёзды вілі, бо лясных птушак не было. Прасіў іх, каб прынеслі з выраю насенне дрэў. Усю зіму чакаў хлопец вясну і марыў аб пасадцы лесу. І вось яна – вясна-прыгажуня. Прыляцелі жаваранкі і ў дзюбах прынеслі доўгачаканае насенне. Беражліва вырошчваў Яраш кволенькія парасткі. Рупліва ўскопваў камяністую глебу і старанна садзіў маленькія дрэўцы. Праз год поле зазелянела, дрэўцы пачалі набіраць сілу. У хуткім часе на месцы пустэчы красаваў маладзенькі лясок. Пасяліліся першыя птушкі і радасна абудзілі прастору. Людзі пачалі хадзіць у лес, каб адпачыць, надыхацца свежым паветрам. Пазней з’явіліся ягады і грыбы, знайшлі сабе прытулак дзікія жывёлы, выраслі пахучыя лясныя кветкі. Радасці людской не было межаў. Вяскоўцы дзякавалі Ярашу за працу, за стараннасць.

Але нядоўгай была радасць людская. Упадабалі гэту зямлю плямёны-заваёўнікі. Напалі яны на мірных жыхароў, хацелі лясок сабе прысвоіць. Выйшаў Яраш з вяскоўцамі на абарону свайго краю. Доўга яны змагаліся, лес і родныя мясціны дапамагалі ім. Ворагі былі разбіты, але Яраш быў цяжка паранены. Не змаглі людзі вылечыць свайго заступніка.

Прайшло з таго часу многа стагоддзяў, лес змяніўся, заняў вялікую тэрыторыю. Памяць пра хлопца засталася ў сэрцах людзей. Старажылы гавораць, што вёска Ярошычы названа ў гонар хлопца Яраша. Непадалёку размяшчаецца возера, якое назвалі Гаворкавым. Яго аблюбавалі лебедзі, якія прылятаюць сюды пагасцяваць з Косічскага вадаёма. Лебедзі – наш гонар. Сёння гэты куточак з’яўляецца любімым месцам адпачынку нашых вяскоўцаў».

*Пётр Каралько агучвае ўласны верш «Дубок».*

Расце каля хаты маленькі дубок,
Прынёс яго бацька мой з лесу, здалёк.
Мы дрэўца садзілі ўдваіх спакваля,
Яго прыняла, як дзіцятка, зямля.
І бацька прамовіў:
– Расці, мой сынок,
Падобны на гэты прыгожы дубок.
Каб кожны з нас дрэва сваё пасадзіў,
Наш край быў, як дзіўная кветка, расцвіў.

**V. Выступленне «эколагаў»**

Праблемай зберажэння прыроды занепакоены не толькі паэты, сумленныя грамадзяне, але і вучоныя ўсяго свету. Міжнародная камісія, у склад якой уваходзяць вучоныя з усяго свету, прыйшла да вываду: каб выратаваць жывёльны свет, неабходна збіраць звесткі аб усіх рэдкіх, знікаючых (або якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення) відах раслін і жывел. Першы варыянт Чырвонай кнігі выдадзены ў 1966 годзе ў швейцарскім горадзе Морж.

У Беларусі Чырвоная кніга пачала выходзіць з 1981 года. Кніга прадугледжвае захаванне рэдкіх жывёл і раслін на тэрыторыі Беларусі, а таксама распрацоўку практычных захадаў, накіраваных на іх ахову.




Чырвоная кніга папаўняецца з кожным годам. Цяпер яна перавыдаецца кожныя дзесяць гадоў.

Вучні нашай школы добра ведаюць расліны сваёй мясцовасці, якія знаходзяцца пад аховай і занесены ў Чырвоную кнігу: сон-трава, званочак сіні, кураслеп лясны, ландыш. Пад кіраўніцтвам настаўніцы біялогіі яны не толькі ахоўваюць рэдкія расліны, але і пішуць навукова-даследчыя працы з мэтай зберажэння прыроды.

У 2015 годзе праца «Відавы састаў і распаўсюджанне ахоўваемых відаў раслін на тэрыторыі Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Свіцязянскі» заняла прызавое месца на абласным конкурсе «Край гарадзенскі».

**VI. Выступленне «біёлагаў»**

– Мы раскажам пра лекавыя расліны. Вучоныя сцвярджаюць, што няма ніводнай расліны, якая б не прыносіла карысць. Нават пякучая крапіва і грыб мухамор з’яўляюцца лекавымі. Грыб мухамор вылечвае жывел. Крапіву выкарыстоўваюць пры лячэнні гіпатаніі, бранхіяльнай астмы, пры сардэчных хваробах.

Каб выкарыстоўваць расліны з лекавымі мэтамі,трэба добра ведаць іх ўласцівасці. Напрыклад дзівасіл (дзіўная сіла) – высокая (да 2 метраў) шматгадовая расліна. З расліны робяць настойкі, сіропы. Дзівасіл вылечвае бранхіт, астму, запаленне легкіх, загойвае раны, спыняе крывацёк, прыдае сілу чалавеку пасля хваробы. У Беларусі сустракаецца мала. Каб зберагчы расліну, людзям трэба збіраць насенне і сеяць яго на дачы ці ў садзе. Насенне выспявае ў канцы верасня.

Многія людзі ведаюць такую расліну, як падбел. Адзіні бок яго лісціка валакністы і цеплы, быццам маці, а другі – халодны, быццам мачаха. Яе кветкі і лісцікі выкарыстоўваюць для лячэння кашлю, гіпертанічнай хваробы, ангіны. Хочацца нагадаць пра ўсім вядомы трыпутнік. Ён заўседы расце пры дарозе і дапамагае падарожным. Яго лісцікі яго лечаць раны, сокам трыпутніку лечаць страўнік і кашаль.

Прымяняюць расліны і ў касметалогіі. Пры дапамозе рамонкаў фарбуюць валасы, робяць касметычныя маскі. Але трэба ведаць, што лекавых раслін з кожным годам становіцца ўсе менш і менш. Таму неабходна вельмі ашчадна ставіцца да кожнай травінкі.

**Настаўнік.** А цяпер прапаную вам аформіць шчыт, які можна змясціць на экалагічнай сцяжынцы.

*(Вучні прапанавалі свае варыянты:не зрывай рэдкія віды раслін;не раскладай вогнішча ў лесе; беражы лес ад пажару; не разбурай мурашнікі; не забруджвай лес; лес – наша багацце.)*

**VII. Падвядзенне вынікаў**

**IX. Рэфлексія**

На дошцы намалявана дрэва. У кожнага з вучняў на сталах выразаны з паперы лісток, на якім трэба напісаць сваё ўражанне ад мерапрыемства і прымацаваць яго на дрэва.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Кукушин, В. С.** География и экология: сценарии творческих уроков / В. С. Кукушин. – М.: Ростов н/Д: МарТ, 2005. – 160 с.
2. **Петров, К. М.** Экология человека и культура: учеб. пособие / К. М. Петров. – СПб.: Химиздат, 1999. – 384 с.
3. **Экологические афоризмы, пословицы, поговорки**: справочное пособие / сост. Н. Ф. Церцек. – М.: ЛИБЕРИЯ-БИБИНФОРМ, 2007. – 80 с.